

# Пётр Міронавіч Машэраў

(13(26) лютага 1918

— 4.10.1980)

# Пётр Міронавіч МАШЭРАЎ (сапраўднае прозвішча — Машэра

Нарадзіўся 13(26) лютага 1918

Веска .Шыркі Сенненскага р-на

Беларускі партыйны і савецкі дзеяч, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў падполля і партызанскага руху ў часы Вялікай Айчыннай вайны.

# Гады дзяцінства. У партызанах

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Скончыў Віцебскі педагагічны інстытут ім. С. М. Кірава (1939). З 15 жніўня 1939 па 22 чэрвеня 1941 працаваў настаўнікам фізікі і матэматыкі ў Расонскай сярэдняй школе Віцебскай вобласці. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны П. М. Машэраў стварыў і ўзначаліў падпольную камсамольскую арганізацыю ў Рассонскім р-не. З красавіка 1942 камандзір партызанскага атрада імя Н. А. Шчорса, з сакавіка 1943 — камісар партызанскай брыгады імя К. К. Ракасоўскага, адначасова з ліст. 1943 — першы сакратар Вілейскага падпольнага абкама ЛКСМБ. П. М. Машэраў прымаў непасрэдны ўдзел у распрацоўцы і правядзенні баявых аперацый. Пад яго кіраўніцтвам партызаны наносілі ўдары па камунікацыях, органам кіравання і забеспячэння нямецкіх войск у Віцебскай і Калінінскай абласцях, Латвійскай ССР. Двойчы паранены.



# Партыйны дзеяч



- 1944—1946: 1-ы сакратар Маладзечанскага абкама;
- 1946—1947: сакратар ЦК ЛКСМБ;
- 1947—1954: 1-ы сакратар ЦК ЛКСМБ;
- 1954—1955: 2-і сакратар Мінскага абкама;
- 1955—1959: 1-ы сакратар Брэсцкага абкама КПБ;
- 1959: сакратар, 2-і сакратар ЦК КПБ;
- 1961: кандыдат у члены ЦК КПСС, з 1964 член ЦК КПСС;
- 1965—1980: 1-ы сакратар ЦК КПБ.
- Кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС з 1966. Дэпутат ВС СССР 3-5-га і 7-8-га скліканняў, з 1966 член Прэзідыўма Вярхоўнага Савета СССР.

- Можна без сумнення казаць, што Машэраў сярод кіраўнікоў савецкай Беларусі быў найбольш папулярным і карыстаўся ўсенароднай павагаю. Ніхто ні да, ні пасля яго так доўга не ўзначальваў беларускую партыйную арганізацыю — 15,5 года. Гісторыкі адзначаюць, што ў перыяд яго дзейнасці Беларусь дасягнула значных поспехаў у развіцці эканомікі, навукі і культуры, стала адной з высокаразвітых рэспублік былога СССР.



- Загінуў у аўтамабільнай катастрофе на трасе Брэст-Масква, каля паварота на Смалявіцкую птушкафабрыку. Аўтамабіль «Чайка», у якім ехаў П. М. Машэраў, урэзаўся ў грузавік. Пахаваны 7 кастрычніка 1980 на Усходніх (Маскоўскіх) могілках (участак № 18) у Мінску.

# Узнагароды

- Герой Савецкага Саюза (15 жніўня 1944) «за гераізм і адвагу, праяўленыя ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў» з уручэннем ордэна Леніна і медалі «Залатая Зорка» (№ 4376).
- Герой Сацыялістычнай Працы (10 лютага 1978) «за вялікія заслугі перад Камуністычнай партыяй і Савецкай дзяржавай і ў сувязі з 60-годдзем са дня нараджэння» з уручэннем ордэна Леніна і залатога медаля «Серп і Молат».
- Узнагароджаны сям'ю ордэнамі Леніна, медалямі.

# Ушанаванне памяці



- Бронзавы бюст
П. М. Машэрава ўстаноўлены ў Віцебску.
- У Мінску імем П. М. Машэрава названыя: праспект (колішняя Паркавая магістраль, цяпер пр-т Пераможцаў) з мемарыяльнай дошкай на доме № 1.
- Завод аўтаматычных ліній.
  - На доме № 13 на вул. Чырвонаармейскай, дзе ... М. Машэраў, мемарыяльная дошка.



- Віцебскі педагагічны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава